

Еўропу будуем разам тут!

ГАСЦІНЕЦ

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

№ 3 (9) Жнівень 2000 года



Рыгор Барадулін

Усебеларускаму З'езду

Беларусь, як брыльянт у
пярсцёнку Еўропы.
Мы болей не хлопы і не
халопы.

Нам богам дадзенае права
Радзімы нашай дзецьмі звацца
І наша даўняя дзяржава
Дзяржавай мусіць заставацца.

Ні перад кім ніколі продкі
Не гнулі гордыя галовы.
У паднявольных век кароткі.
У пастцы толькі сыр дармовы.

Як сэрца біцца перастане
Матулі нашай, нас не стане.
І толькі застанушца здані
У напамін аб цёмным змане.

Не варта вабіцца дарамі,
Што абяцаюць у прымусе.
Дык будзем жа гаспадарамі
У цёплай хаце Беларусі!

АКТ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ

Мы, дэлегаты Усебеларускага з'езда, паўнамоцныя прадстаўнікі народа Беларусі,

– усведамляючы адказнасць за будучыню краіны;

– нагадваючы, што Рэспубліка Беларусь з'яўляецца дзяржавай- заснавальніцай Арганізацыі Аб'яднанных Нацый;

– грунтуючыся на прынцыпах і нормах міжнароднага і нацыянальнага права,

● ЗАЯЎЛЯЕМ: ●

Беларускі народ мае тысячагадовую гісторыю сваёй дзяржаўнасці: ад Полацкага княства, Вялікага княства Літоўскага, Беларускай Народнай Рэспублікі да сучаснай Рэспублікі Беларусь. Прынятая Вярхоўным Саветам 27 ліпеня 1990 года Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце сцвярджае яго дзеля галоўнай мэты - свабоднага развіцця і дабрабыту, годнага жыцця кожнага грамадзяніна Беларусі. Яна абвяшчала незалежнасць краіны ў вонкавых дачыненнях, вяршэнства самастойнасці і паўнату дзяржаўнай улады, дзеючай на падставе правамоцных законаў. Любыя дзеянні супраць суверэнітэту Беларусі і нацыянальнай дзяржаўнасці недапушчальныя і павінны карацца як найвялікшае злачынства.

Дзяржаўны суверэнітэт быў замацаваны ў Канстытуцыі, прынятай 15 сакавіка 1994 года. Паводле яе Беларусь увайшла ў свет як нейтральная мірная і бяз'ядзерная дзяржава. Незалежнасць Беларусі з'яўляецца набыткам не толькі сённяшняга пакалення, але і нашых продкаў і належыць нашчадкам. Суверэнітэт краіны не можа быць абмежаваны альбо скасаваны праз рашэнні дзяржаўных асоб і органаў, нават праз рэферэндум.

Сёння незалежнасць Рэспублікі Беларусь знаходзіцца пад пагрозай. Рэальнай небяспекай ёй стаў дагавор аб стварэнні так званай саюзнай дзяржавы з Расіяй, падпісаны 8 снежня 1999 года прадстаўнікамі беларускіх улад, чыя легітымнасць не прызнаецца ў большасці краін свету. Мы — за добрыя, раўнапраўныя і ўзаемавыгадныя адносіны з усімі краінамі свету, і асабліва з суседзямі: Расіяй, Украінай, Польшчай, Літвой, Латвіяй. Але мы не жадаем станавіцца рэгіёнам іншай дзяржавы.Мы не дазволім ліквідаваць нашу незалежнасць і абмежаваць наш суверэнітэт, знішчыць нашу краіну.

Незалежнасць - гэта натуральнае права ўсяго народа, кожнага грамадзяніна. Толькі яна і толькі дзяржаўны суверэнітэт адкрывае шлях нашай краіне ў еўрапейскую і міжнародную дэмакратычную супольнасць.

Мы, дэлегаты Усебеларускага з'езда,

● СВЕДЧЫМ ●

Богам і гісторыяй дадзенае нашаму народу права мець сваю незалежную дзяржаву з яе адвечнымі сімваламі - бел-чырвона-белым сцягам і гербам «Пагоня»;

● АБВЯШЧАЕМ ●

незалежнасць і дзяржаўны суверэнітэт неад'емнай каштоўнасцю беларускага народа;

● ПРЫЗНАЁМ ●

не маючымі законнай сілы любыя пагадненні і рашэнні, скіраваныя на скасаванне альбо абмежаванне суверэнітэту Беларусі;

● ЗАКЛІКАЕМ ●

усіх грамадзян Беларусі і ўсіх суайчыннікаў за мяжой згуртавацца вакол ідэй Акта незалежнасці Беларусі, бараніць незалежнасць Айчыны;

парламенты і ўрады дэмакратычных дзяржаў, міжнародныя арганізацыі і сусветную грамадкасць забяспечыць гарантыі суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Жыве Беларусь!

Прынята Усебеларускім з'ездам 29 ліпеня 2000 года ў Мінску.



Беларусам нельга здраджваць сваёй культуры!

Ва Ўсебеларускім з'ездзе за незалежнасць ад Гарадоцкага раёна прымаў удзел Леанід Пятровіч Казак, удзельнік маладзёжнай патрыятычнай арганізацыі Саюз Беларускіх Патрыётаў (СБП), якая прапагандавала беларускае слова, культуру ў 1946-1947 гадах у заходняй частцы Віцебшчыны. Калі б на Беларусі была б нармальная дзяржаўная ўлада, то асобы падобныя Леаніду Пятровічу, былі б найбольш паважанымі грамадзянамі, бо яны сваім зламаным лёсам набліжалі час незалежнай Беларусі. Але час ушанавання іх патрыятычных учынкаў яшчэ наперадзе, калі на Бацькаўшчыне будуць кіраваць яе верныя сыны.

Спадар Казак з ахвотай пагадзіўся даць першае інтэрв'ю нашай газеце.

Шаноўны Леанід Пятровіч! Якія асноўныя вехі вашага жыцця?

- Нарадзіўся я ў 1927 годзе ў в. Лугі, каля Лужкоў, што ў Шаркаўшчынскім раёне. Закончыў школу ў Лужках і ў 1944 годзе паступіў вучыцца ў Глыбоцкае педвучылішча. Сярод беларускай моладзі ўзнікла зусім нармальнае жаданне шанаваць родную мову, культуру, традыцыі, супрацьстаяць татальнай русіфікацыі Беларусі. Будучыя педагогі аб'ядналіся ў свой вольны час дзеля захавання роднай культуры ў суполку - Саюз Беларускіх Патрыётаў (СБП). Агітавалі мы за беларускую культуру, але камуністычныя ўлады арыштавалі сяброў арганізацыі - маладых педагогаў і асудзілі на 10-15 гадоў сталінскіх канцлагераў. З 1947 па 1953 я правёў у камуністычных канцлагерах, потым было пяцігадовае паражэнне ў правах. Выжыў у ГУЛАГу толькі дзякуючы моцнай спартыўнай падрыхтоўцы - быў чэмпіёнам Беларусі па штурханню ядра, а таксама харчовай падтрымцы бацькоў. Ва ўмовах каланізацыі Беларусі вяртацца на Радзіму не было сэнсу: нашы веды Бацькаўшчыне былі не патрэбны.

Сорак пяць год адпрацаваў на Калыме, зарабіў кааператыўную кватэру і ў 1992 пераехаў на Беларусь, стаў жыць у Гарадку.

Леанід Пятровіч, якое ўражанне зрабіў на Вас Усебеларускі з'езд?

- Пры пастаянным здзеку з усяго беларускага, пры тым што многія ўраджэнцы Беларусі не лічаць сябе беларусамі, пры ўсёй інтаграцыйнай шуміхі ўлад я ўбачыў, што на Беларусі даволі многа беларусаў, для якіх беларуская дзяржава святая каштоўнасць. На мяне зрабіла добрае ўражанне беларуская гаворка Міхаіла Чыгіра, экс-прэм'ера - адчуваецца, што гэта наш беларус, а не прыблуда. Сярод дэлегатаў з'езда я бачыў толькі разумныя твары, а прамоўцы выказвалі мудрыя думкі аб тым, што трэба рабіць для захавання Незалежнасці Беларусі. Я адпачыў душой, бо хлусні, брыдот і паклёпніцтва не было і ў паміне, а высокія думкі магчыма было выказаць і па-беларуску.

Як Вы ацэньваеце сучасны стан беларускай мовы, культуры?

- Мне цяжка даваць прафесійны каментарый, бо асноўную частку жыцця правёў за межамі Беларусі, але свае адносіны выкажу.

Ёсць невялікі анекдот. У армянскага радыё спыталі: «Якая мова самая цяжкая?» Радыё адразу дала адказ: «Беларуская... Бо яе шэсць год вучаць прэзідэнт, Саўмін, вертыкаль і ніяк вывучыць не могуць». Ў кожным анекдоце ёсць частка ісціны.

Усім грамадзянам трэба добра зразумець: паважаюць тых, хто шануе сваё, ведае сваю гісторыю, культуру. Нельга здраджваць сваёй культуры. На трасянцы культурным чалавекам не будзеш. Ніхто цябе ў свеце не будзе лічыць цывілізаваным чалавекам, калі ты не ведаеш сваіх каранёў. Гэту існуючую для значнай часткі грамадзян праблему магла бы дапамагчы вырашыць дзяржава, калі б яна была сапраўды беларускай, калі б ёй кіравалі беларусы, а не запраданцы. Каб усё гэта асэнсаваць трэба мець розум. Пакуль яго ў большасці грамадзян не хапае.

Дзякуй, спадар Леанід Пятровіч за шчырую размову!

Шаноўныя ўдзельнікі з'езда, дарагія сябры!

Рады вітаць ваш сход, што мае повязь з гістарычным першым Усебеларускім з'ездам, які адбыўся напрыканцы 1917 года і быў вызначальным крокам да ўзнікнення сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

Ёсць упэўненасць у тым, што ў новым сусветным парадку, у які мы патрапілі за мінулыя дзесяць гадоў і які прынёс шмат змен у нашым жыцці, разам могуць у згодзе і роўнасці супрацоўнічаць толькі такія ўдзельнікі, якія самі ўсвядомілі сваё ўласнае вызначэнне. Веру, што напамін і спадчына беларускай дзяржаўнасці ды незалежнасці ёсць неабходная прадумова ўмацавання нацыянальнага самавызначэння беларускай дзяржавы.

У сваіх размовах з людзьмі, якія паходзяць з вашага краю ці займаюцца яго вывучэннем, шматкрат адчуў, што на Беларусі жыва памяць пра тое, якім чынам паў камунізм, што меўся на нашых землях. Лічу за частку адказнасці кожнага грамадзяніна Чэшскай Рэспублікі, кожнага еўрапейца і ўласна ўсіх, хто прызнае ды бароніць такія каштоўнасці, як дэмакратыя, захаванне правоў чалавека ды свабоды асобы, праяўляць цікавасць да становішча, у якім знаходзіцца Беларусь і яе грамадзяне, каб паводле сваіх магчымасцяў словам і справай дапамагаць прасоўванню дэмакратыі на Беларусі. Жадаю вашаму сходу спакойнай хады і шмат поспехаў!

З прывітаннем — **Вацлаў ГАВЭЛ**, прэзідэнт Чэшскай Рэспублікі.

Прывітанні

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі вітае ўдзельнікаў Усебеларускага з'езда за незалежнасць, які сабраўся ў Мінску 29 ліпеня 2000 года.

У час паважнай пагрозы існаванню беларускай дзяржаўнасці верныя сыны і дочкі Беларусі, прадстаўнікі ўсіх раёнаў краіны, сабраліся на гэты форум, каб заявіць перад цэлым светам, што найвялікшая каштоўнасць для беларускага народа — гэта свая незалежная дзяржава.

Ужо больш як 80 гадоў Рада БНР усімі даступнымі сродкамі даводзіць свету, што Беларусь як еўрапейская краіна са сваёй тысячагадовай гісторыяй і апрычонай культурай мае поўнае права на незалежнасць. Рада БНР, аб'ядноўваючы беларусаў, раскіданых па ўсіх кантынентах зямлі, працягвае паслядоўна дамагацца міжнароднай падтрымкі беларускай дзяржаўнасці, якой ізноў пагражае расійскі імперыялізм.

Шаноўныя суродзічы, дарагія сёстры і браты! Беларуская моладзь!

Гісторыя чалавецтва поўная прыкладаў, калі свабода даставалася коштам вялізных намаганняў цэлых пакаленняў. Будзьма ж вернымі папярэднім пакаленням змагароў за волю Беларусі. Заставаймася разам пад святым бел-чырвона-белым сцягам, бо толькі на гэткім шляху мы станемся гаспадарамі сваёй зямлі і свайго гістарычнага лёсу, і толькі тады мы здабудзем для нашай Бацькаўшчыны шчаслівую будучыню.

Няхай дапаможа нам Бог!

Жыве Беларусь!

Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі —

Івонка СУРВІЛЛА, старшыня Рады БНР.

Шаноўнае спадарства!

Сардэчна вітаю і віншую дэлегатаў і ўдзельнікаў Усебеларускага з'езда за незалежнасць — важнейшага чынніку на шляху да святой мэты — незалежнай, суверэннай беларускай дзяржаўнасці.


Жыве Беларусь!

Васіль БЫКАЎ.



Пісьменнік Яўген Будзінас вітае пасла Францыі ў Беларусі Бергара Фасье (у цэнтры - сустаршыня аргкамітэта Усебеларускага з"езда Генадзь Бураўкін).

Фота Irex/Pro Media



Літаратурная старонка



Спроба пяра вучняў Езярышчанскай СШ
Настаўніца роднай мовы - Таццяна Маранава

Беларусь

Калі хто на чужыне спытае:
- Ты адкуль? З якога ты краю?
Вельмі горда я адкажу:
- З Беларусі. З прыгожага краю.
Я табе пра яе раскажу.
Беларусь, як кляновы лісточак
На якім сотні кропель расы.
Для яе будзеш ты як сыночак,
Тут без бед пражывеш ты заўжды.

Алена Нішчацюк, 6б кл.



У Беларусі роднай я жыву,
І радзімай яе называю.
Тут жыву, тут расту і дышу,
Не жадаю я іншага краю.

Ніна Міхайлава, 6а кл.

* * *

Матуля навучыла роднай мове,
Каб гаварыць на ёй умеў.
Айчына прывіла любоў да мовы,
Каб песні Айчыны я разумеў.

Саша Чарноў, 6б кл.

Мая Беларусь

Беларусь мая радная,
Я табою даражу,
Зямля Беларусі святая,
Пра гэта ўсім раскажу.
Скажу пра зімовыя сцюжы,
Пра ветры і маразы,
Зіма ўсё заўюжа-закружа,
Па снезе рыпяць палазы.
А як тут цудоўна улетку
Па зорнай прайсці па расе,
А увечары гожую кветку
Твой сябар табе прынясе.

Яна Дадонава, 7а кл.

Мая Радзіма

Як мне назваць цябе, Радзіма?
Ты сонцам свеціш нада мной
Лугоў тваіх так беражліва
Мяне агортвае спакой.
Ты нам даруеш цуд лясоў,
Блакіт азёр і сінеч неба,
Ты не шкадуеш для мяне
Ні срэбра зор, ні хвалі хлеба.
Даруеш шчасце, радасць, смех,
Заўсёды будзеш мне святыняй.
І я за беларусаў усіх
Заву цябе маёй Айчынай!

Ірына Клюева, 7б кл.

* * *

Вось і сонейка свеціць ярчэй,
У Езярышчы сышоў снег з палей,
Гэта значыць – вясна ўжо прыйшла,
Цёплы ветрык з сабой прынясла.
Ручайкі сталі нешта спяваць,
І буслы ўжо на гнёздах стаяць
Гэта значыць – бывай ужо, зіма!
Прывітанне, Царыца – Вясна!

Іра Марковіч, 7б кл.

Кветкі

І на лузе, і на полі
Вырастаюць кветкі,
Жвава каля іх лятаюць
Матылёчкаў дзеткі.
Кветкі – эалацінкі,
Прыгожыя хусцінкі,
Кветкі я кахаю,
Дарма не зрываю.

Езярышча

Езярышча маё – бы рамонак,
Гэта вельмі прыгожы пасёлак.
Езярышча славутае намі,
Упрыгожым яго ўсе мы самі.

Жэня Яўсеева, 6а кл.

Мой самы родны, родны край!
Мне тут да кроплі ўсё знаёма:
Палі, рачулкі, небакрай ...
Я тут шчаслівая, я – дома.
Я гэтым шчасцем ганарусь,
І ў думках я ўдзячна ёй,
І ў пояс нізка пакланюсь
Маёй старонацы роднай.

Маша Альшэўская, 10 кл.



Беларускае слова –
Шчыры скарб для мяне.
Беларускую мову
Я адкрыю ў сабе.
Ты прыедзь хоць на трошкі,
Тут са мною пабудзь,
Родны край мой ніколі,
Я прашу, не забудзь.

Сяргей Байдакоў, 10 кл.

* * *

Ішоў я па лесе,
Насустрач мне – воўк.
Яму гавару я:
- Паслухай, браток,
Іду я ў лес пагуляць, падышаць,
Прашу цябе, браце,
Не перашкаджаць.

Андрэй Жаркі, 6а кл.





Паданні пра Езярышча ў інтэрпрэтацыі вучняў

Пра Езярышчанскае гарадзішча існуе шмат паданняў. Кажуць, што там ёсць зачараваны скарб, які надзейна ахоўваюць розныя міфічныя істоты: начніцы, прыгожая дзяўчына-здань, страшэнныя пачвары.

Кажуць, што да скарба ёсць два падземных хода, адзін знаходзіцца сярод развалін былога замка, а другі – на стромкім беразе ля самай вады.

Расказвалі і пра двух хлапчукоў, што знайшлі той ход, што ішоў ад вады. Яны прабраліся па яму да жалезных дзвярэй, доўга не маглі іх адчыніць. Нарэшце дзверы крыху паддаліся, але адначасова ўсё навокал загрукпцела, захісталася, пасыпалася зямля, нехта, нібы, застагнаў. Вялікага жаху нацярпеліся хлопцы, пакуль выбраліся адтуль.

Пазней прыходзілі яны на тое месца з сябрамі, але ўваходу у паддзямелле ўжо не знайшлі. Толькі, нібы, хто смяяўся з іх, і быў той смех падобен не смех маладых дзяўчат. Сталыя людзі пасля казалі, што гэта начніцы насміхаліся, а хлопцы думалі, што мо з перапугу ім здалося.

Прайшло шмат часу, а зачараваны скарб усё яшчэ чакае смелага і кемлівага чалавека, здольнага яго знайсці.

Ганна Архірэева, 7б кл.

НАШ КАЛЯНДАР

9 жніўня споўнілася 90 год з дня нараджэння Ларысы Геніюш – выдатнай беларускай паэтэсы. Усё яе жыццё было прасякнута любоўю да Беларусі, нягледзячы на тое, што савецкія ўлады увесь час пераследвалі яе і пэўны час яна правяла ў сталінскіх канцлагерах. Прасягнуўшы на вернасць Беларускай Народнай Рэспубліцы, так і засталася Ларыса Антонаўна яе грамадзянкай.

У яе вучыліся патрыятызму, павагі да Бацькаўшчыны многі вядомыя дзеячы нашай культуры. На памяць нам засталіся вершы паэтэсы ў яе шматлікіх кніжках. Многія яе вершы пакладзены на музыку беларускімі "Песнярамі".

Але з 1999 года творчасць славутай паэтэсы забаронена для вывучэння ў школе. Прапануем чытачам вершы з кнігі "Ластаўка", выдадзенай у 2000 годзе і якую магчыма набыць у кнігарнях.

ЛАСТАЎКА

Зелянеў пявучы май,
Да зямлі прыпаўшы.
Закахаўся папугай
У ластавачку нашу.

Не пяюн, а лапатун,
Рыжы, як з пажару,
Можа ён і прыгажун,
Ластаўцы — не пара.

Ластавачка над зямлёй
Нізка пралятала
І на мове, на сваёй,
Гэтак шчабятала:

— Вопратку тваю хвалю.
Гонар — паважаю.
Ўсё ж, скажу,
Я не люблю
Розных папугаяў,
Што дзяцей пужаюць.

Калі хочаш з намі жыць,
Есці нашы мушкі,
Навучыся гаварыць
Лепш па-беларуску.

МАЯ МОВА

У добры час, на улонні вясковым,
Дзе вадзіца крынічная б'е,
Навучыўся я матчынай мове
І задуманых песняў яе.

Многа ёсць недасягнутых скарбаў,
Яшчэ болей прываблівых мар.
Я яе нізашто не аддаў бы,
Бо яна найвялікшы мой скарб!

Яна гойдае спевам калыску,
Літасціва шчабеча ў бядзе,
На ёй песні складаюць вятрыскі
Ў неспакойны, разбуджаны дзень.
Мая мова не знае змярканняў
Ад маленства да старасці лет,
Буду песціць яе, як каханне,
Разглядаць, як чароўны букет.

Можа, мовы чужой навучуся,
Каб суседзяў гасцінна вітаць,
Але толькі на ёй, беларускай,
Буду людзям аб долі пяяць.

Мая мова, як шчасце на вуснах,
Хвалявання гарачы прыбой,
Можа быць, на чужой засмяюся,
Ўсё ж заплачу з тугі на сваёй.

ЗАЙКА

Між кустамі,
Між густымі,
Скок ды скок,
Бегаў зайка, прытаміўся.
А за дрэвам прытаіўся
Люты воўк.
Зайка скокнуў без аглядкі,
Воўк хацеў хапіць за пяткі
Ды за бок.
У адчыненыя дзверы
Да бабулі зайка шэры
Хутка скок.
Бабка заіньку пусціла,
Прытуліла, накарміла.
А дзядуля злога воўка
Напалохаў дубальтоўкай.
А ты, заінька, глядзі —
У лес без мамы не хадзі.

СПІ, АЛЁНКА

—Спі, Алёнка, Маленькая, спі.
Вунь пад зорамі дрэмлюць палі.
Вецер коўдраю іх прыкрывае.
— Як мяне?
— Як цябе, дарагая.
— Хто ім казачку бае?
— Бары.
— Хто ім песню спявае?
— Вятры.
— Хто іх туліць?
— А туліць зіма.
— Хто да працы іх збудзіць?
— Вясна.

ХЛЕБ

Наш жытні хлеб я выпякаць умела,
Рашчынены, замешаны ў пару,
Прапёкся каб, скарынка не счарнела,
Загладжаная ласкай маіх рук.
На лісцейку дубовым, на аеры.
І пахне з хаты хлебам па сяле.
І першы бохан з крыжам на павер'е,
Каб спорыўся надзённы на стале.

І смакаваў пахучы, чорны, жытні
З гарачай печы родны каравай.
Хвалілі госці хлеб і старажытны,
Багаты хлебам, беларускі край.

Наш жытні хлеб я выпякаць умела,
Рашчынены, замешаны ў пару,
Прапёкся каб, скарынка не счарнела,
Загладжаная ласкай маіх рук.
На лісцейку дубовым, на аеры.
І пахне з хаты хлебам па сяле.
І першы бохан з крыжам на павер'е,
Каб спорыўся надзённы на стале.

І смакаваў пахучы, чорны, жытні
З гарачай печы родны каравай.
Хвалілі госці хлеб і старажытны,
Багаты хлебам, беларускі край.

Рупліўцы роднага слова

7 чэрвеня адбылося падвядзенне вынікаў конкурса сярод настаўнікаў Гарадоччыны "Рупліўца роднай мовы", які быў абвешчаны Гарадоцкім РАА і Гарадоцкай Радай ТБМ. У конкурсе прынялі удзел педагогі 10 школ раёна у трох намінацыях: настаўнікі роднай мовы; настаўнікі пачатковых класаў; настаўнікі геаграфіі, гісторыі і іншых прадметаў. Настаўнікі прадэманстравалі метадычныя распрацоўкі па фарміраванню павагі да роднага слова, культуры, а таксама элементы сучасных педагагічных тэхналогій, якія прымяняюцца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

На выніковай канферэнцыі былі зроблены даклады настаўнікаў аб сістэме працы па прывіццю павагі да роднай мовы, прадстаўлены метадычныя знаходкі ў пашырэнні ведаў аб нацыянальнай культуры, развіццю творчых здольнасцей вучняў.

Журы адзначылі лепшую школу, прыняўшую ўдзел у конкурсе – Стадалішчанскую СШ, а таксама лепшых настаўнікаў – рупліўцаў роднага слова: Лапаціну Л. М. (Гарадоцкая БШ), Кузняцову В. М. (Вархоўская БШ), Маранаву Т. Ў. (Езярышчанская СШ), Міхалевіч Т. Г. і Калініну Л. П. (Стадалішчанская СШ), Кузьменку Л.І (Вархоўская БШ).

Усім удзельнікам конкурса былі прэзентаваны: кніга "Паэма "Тарас на Парнасе": здабыткі і праблемы", апошні нумар культурна-грамадскай газеты Гарадоччыны "Гасцінец", а пераможцам уручаны памятныя сувеніры, прадстаўленыя Віцебскім аддзяленнем ГА "Фонд імя Льва Сапегі".

Свята роднага слова адбылося, дзякуючы падтрымцы метадыстаў РАА: Дзергачовай А. Ў., Камінскай Г.А., Ярашовай Н. Д. і актывістаў ТБМ.

Заснавальнік і рэдактар Леанід Гаравы.
Адрас: 211540, г. Гарадок, вул. Гагарына, 30б - 16
Тэл. 8-239-2-38-42
E-mail: gasc@gar. belpak.vitebsk. by
Выдадзена пры падтрымцы Віцебскага аддзялення ГА «Фонд імя Льва Сапегі»
Распаўсюджваецца бясплатна. Наклад 290 асобнікаў